■ Прэм'ера

# ...І ТУТ ДАДОМУ ВЯРТАЕЦЦА ЖОНКА...

## Анекдатычная сітуацыя на сцэне Маладзёжнага тэатра

**Немалады мужчына прыводзіць у дом прывабную ды рэзвую дзяўчыну, якая ўвесь час імкнецца перайсці да «галоўнага» (згодна з яе ўяўленнем). Але Стэфан так адразу не можа, нават упіраецца. Нібыта адчувае, што робіць фатальную памылку. Але калі дзяўчо ўжо амаль перааддолела супраціў, раптам з'яўляецца жонка... Застаецца сказаць праўду: гэта зусім не тое, што яна падумала, гэта яго... пазашлюбная дачка, да якой ён употай шмат гадоў ездзіў з Ніцы ў іншы горад, каб спаткацца ці выправіць у школу...**



О, амаль Францыя! Лёгкая інтрыжка і каханне на ўсё жыццё. Маладзенькая палюбоўніца і жанчына, якая ведае сабе цану. А яшчэ мужчына, дзеля якога варта закруціць складаную гульню і ўзяцца апякаць нібыта дачку. Ён, бедны, ужо і сам не ведае, як пазбавіцца ад дзяўчыны, што апынулася ў яго доме ўначы (чыста выпадкова!) у выніку легкадумнага адзюльтэру...

Праўда, у глядзельнай зале былі не французы, хоць публіка і старалася выяўляць тонкі французскі гумар і смяялася там, дзе не смяяцца было немагчыма. Прэм'ера спектакля «Сямейны ўікэнд» у Беларускім дзяржаўным маладзёжным тэатры адбылася ўлетку, калі віруе пачуццёвасць. І калі кожны (нават той, хто працуе і застаецца дома) жадае адпачыць. Камедыя — лепшы жанр для магчымасці разняволіцца ў тэатры. Тым больш — пад заслону тэатральнага сезона.

Малады рэжысёр Таццяна Аксенкіна (але гэта ўжо пятая пастаноўка ў Маладзёжным тэатры) абрала п'есу французскага акцёра і драматурга Жана Поля Пуарэ, якая прайшла праверку часам і рознымі тэатрамі, у тым ліку беларускімі. У асноўным яна запатрабаваная ў антрэпрызных камерцыйных праектах. Нездарма: гісторыя ненавязлівая, амаль бытавая (таму пойдзе ў любой краіне). Але расказвае яна пра зусім небанальныя «сямейныя разборкі», дзе адна хлусня перакрываецца іншай, кожная наступная здаецца яшчэ больш абсурднай, таму і смешнай. Інтрыга толькі ў тым, хто каго перайграе і перахлусіць. Ды толькі ў гэтым інтрыгі амаль ніякай, хоць правярай вядомую показку: не капай іншаму яму...

Інтрыгі не атрымаецца яшчэ і для тых, хто любіць старыя французскія камедыі: па ходу спектакля ўзнікаюць паралелі з фільмам «Вясёлы Вялікдзень» (паводле Жана Пуарэ), дзе галоўныя ролі выконвалі Жан Поль Бельмандо і маладзенькая Сафі Марсо. Лёгкая камедыя ў французскім стылі, дзе сюжэтная лінія была разбаўленая каскадзёрскімі трукамі, каб не зусім нагадваць анекдот. Хоць французы — майстры экранізацыі анекдотаў.

Французскі анекдот з беларускім тэмпераментам выглядае ўжо не такім лёгкім. Таму што нават у анекдотах мы ўмеем расчытаць мараль. І Стэфан — вельмі прыстойны чалавек, як яго ролю іграе артыст Яўген Іўковіч, зусім не хацеў здраджваць (мы ж бачылі на свае вочы!), ён проста паддаўся спакусе, часоваму памутненню ў галаве. У гэтым яго глыбокая чалавечая драма, што мы і назіраем, нават шкадуем героя. Хоць жанр камедыі ўсё ж бярэ сваё і згодна з яго ўмовамі заломвання рук пакрыўджанай жонкі няма: у інтэрпрэтацыі артысткі Марыі Бліновай усё ж адчуваецца вера ў тое, што яе муж зрабіў памылку. Таму яна стараецца паставіць яго ў яшчэ больш няёмкае становішча, каб пашкадаваў і ўрэшце павініўся. Але гэта робіць дзяўчына (артыстка Ганна Лаухіна). Нават неяк нечакана: увесь час яе паводзіны, міміка былі нібыта з выклікам, і ў развіцці гэтай ролі нічога не абяцала менавіта яе прызнання. Відаць, як жанчына яна зразумела другую жанчыну. Малайчына, атрымлівае пернік. Менавіта ў доме свайго так званага «таты» сустракае маладога чалавека з арыстакратычнай і заможнай сям'і Вальтэрай, якога не палохаюць эксцэнтрычныя паводзіны п'янай сапраўднай маці дзяўчыны, з'яўленне якой яшчэ больш заблытала сітуацыю. І смех, і слёзы. І ўсё ж мараль: гэта ўжо па-нашаму. Таму што там, дзе французы бачаць камедыю, нашы гледачы здольныя адчуць драму.

«Ох!..» — перажывала за сям'ю, якая развальвалася на вачах, сталая жанчына побач са мной. Рукой, шчодра ўсыпанай залатымі пярсцёнкамі, працірала вочы, мокрыя ад смеху (ці?..). І хлопала па руцэ спадарожніка — мужа, у амаль такім жа касцюмчыку, як галоўны герой. Наогул сталых людзей у Маладзёжным тэатры тым вечарам было шмат. Можа таму, што яны вельмі любяць камедыі? Яны шмат працуюць, маюць поўнае права вечарам не напружвацца ад складаных думак. Людзі з жыццёвым вопытам ведаюць, што трэба шукаць пазітыў у любых сітуацыях, яны імкнуцца адпавядаць іміджу тых асоб, у якіх усё добра. Тэатр ім патрэбны дзеля задавальнення і прыстойнага (!) баўлення часу.

Сітуацыі, падобныя на тую, што разглядаецца, яны, відаць, адчуваюць і могуць з іх пасмяяцца (але да пэўнай мяжы — у некаторыя моманты мая суседка кідала суровы погляд на спадарожніка). Акрамя таго, гэтыя людзі, як правіла, са стабільным заробкам. Што і патрабуецца даказаць і паказаць. Такія гледачы сёння вельмі патрэбныя айчынным тэатрам — запаўняючы залу, яны дапамагаюць закрываць планы. На камедыях гэта значна прасцей, чым на творах, якія патрабуюць думкі і эмацыянальнага напружання. А цяпер нашы тэатры, акрамя чыста мастацтва, павінны дбаць пра прыбытак. Камедыі — тое, за кошт чаго гэтага дасягнуць прасцей. Таму французскія і не толькі камедыі, спектаклі выключна дзеля баўлення часу і асалоды ёсць у розных нашых тэатрах. І будуць, відаць. Але добра, калі яны ўраўнаважваюцца пастаноўкамі, якія даюць глебу для роздуму. Дарэчы, ёсць такія і ў Маладзёжным тэатры — прыглядзіцеся, калі скончыцца лета.

**Ларыса ЦІМОШЫК**

■ Дзеля памяці

# СЛОВЫ ПАДАЮЦЬ НЕ НА КАМЕНЬ

## Пайшоў з жыцця пісьменнік Іван Пташнікаў

**У гісторыі беларускай літаратуры ёсць імёны творцаў, якія ў чытача адразу ж выклікаюць дакладныя асацыяцыі. Калі гаворка ідзе пра Івана Пташнікава, прыгадваецца вёска. І гэта не тая вясковая проза, што даўно састарэла і здаецца неактуальнай сёння, але глыбокая, густая, поўная дакладна намаляваных партрэтаў і трапных выразаў. А яшчэ — слоў і вобразаў, звязаных з роднымі мясцінамі пісьменніка — Лагойшчынай.**



Дэбютаваўшы ў літаратуры як паэт, Іван Пташнікаў хутка намацаў іншую дарогу ў творчасці — прозу. Грунтоўную, сур'ёзную, класічную. Таму і не дзіўна, што хутка завяваў любоў чытача і павагу крытыкаў. Першую аповесць пад назвай «Чачык» апублікаваў у 1957 годзе ў часопісе «Полымя», і ўжо праз два гады выйшла яго першая кніга апавяданняў «Зерне падае не на камень». Потым былі знакамітыя раманы: «Тартак», што праз некаторы час стаў тэлефільмам; «Алімпіяда», перастварвны ў выглядзе тэлеспектакля; «Найдорф», які прынёс аўтару Дзяржаўную прэмію Беларусі імя Якуба Коласа.

У прозе Івана Пташнікава гучаць антываенныя матывы, бачацца трагедыі спаленых вёсак, скалечаныя лёсы простых людзей. Гаворка ідзе не толькі пра вайну, але і пра чарнобыльскую трагедыю. Гэтая катастрофа таксама не пакінула празаіка абыякавым, ён адгукнуўся страшным апавяданнем «Львы».

Яркі прадстаўнік філалагічнага пакалення айчынных пісьменнікаў. Паплечнік Уладзіміра Караткевіча, Міхася Стральцова, Вячаслава Адамчыка, Іван Пташнікаў быў і выдатным рэдактарам, доўгі час загадваў аддзелам прозы часопіса «Полымя».

Так, Іван Пташнікаў — адзін з нашых класікаў. Яго творы вывучаюцца ў школе і ва ўніверсітэтах, ды і пазней не застаюцца на паліцах, чытаюцца і перачытваюцца. А гэта значыць, што словы творцы, прамоўленыя дзесяцігоддзі таму, упалі не на камень, што і пасля адыходу аўтара ў лепшы свет яны будуць вечна жыць у нашай літаратуры, у памяці беларускіх чытачоў.

**Светлая вам памяць, шаноўны Іван Мікалаевіч.**

■ На адкрытай прасторы

# ВЯЧЭРА НА ТРАВЕ

## Традыцыі розных стагоддзяў у гарадской культуры

**Сёлета вядомы ў Еўропе латвійскі гурт Brainstorm ужо наведаў з канцэртамі безліч гарадоў у Велікабрытаніі, Ірландыі, Эстоніі, Літве, Расіі... Нарэшце, у графіку музыкантаў значыцца мінскі Лошыцкі парк — на новым для нашай сталіцы фестывалі «A-fest», што пройдзе 13 жніўня, яны далучацца да беларускіх гуртоў J:МОРС, Navi, Ё-Гурт і Ганны Шалюціной, каб разам разварушыць густую атмасферу. Фестываль «A-fest» — гэта спроба стварыць новую гарадскую культурную прастору, аб'яднаць традыцыі XIX стагоддзя і сучасныя павевы і ўспомніць імя знакамітага графа Чапскага, мудрагелістым чынам звязанага з сядзібай Любанскіх, што знаходзіцца на тэрыторыі Лошыцкага парка.**

У свой час, дарэчы, сядзіба лічылася цэнтрам культурнага жыцця Мінска. Па адной з легендаў граф Чапскі, знакаміты мэр Мінска, што любіў бавіць час у Лошыцкім парку, адыграў у яго лёсе сумніўную ролю. Неяк Яўстафій Любанскі, уладальнік сядзібы, заспеў сваю маладую жонку Ядвігу Кяневіч у абдымках Чапскага, а тая ў сваю чаргу ўтапіла сваю ганьбу ў Свіслачы. Але гэта настолькі ж верагодная легенда, як і далёкае ад салонных драм меркаванне, што яе лодка проста перавярнулася ў той час, як плаваць пані не ўмела.

**Сімвалічна «A-fest» пройдзе напярэдадні дня нараджэння графа Чапскага, бо ён зрабіў для горада шмат важнага і мадэрновага.**

Тым не менш слава і ў сядзібы, і ў парка засталася, роўна як і гул ад некалі бурлівага культурнага жыцця. Таму сучасная стратэгія развіцця Лошыцкага парка, накіраваная на развіццё лесапаркавай зоны ў Еўропе, мае чым карыстацца, калі гаворка ідзе пра мінуўшчыну і традыцыі. Сімвалічна, што «A-fest» пройдзе напярэдадні дня нараджэння графа Чапскага, бо Карл Эмерыкавіч у час свайго «мэрства» зрабіў для горада шмат важнага і мадэрновага.

«Правядзенне першага фестывалю «A-fest» стане спробай стварыць у сталіцы новую традыцыю, — расказвае Ганна Губкіна, дырэктар па маркетынгу і развіцці бізнесу кампаніі «Аліварыя» — арганізатара фэсту. — І хоць рэгулярныя мерапрыемствы ў вялікай колькасці ўжо ўпісаны і ўпісваюцца ў каляндар Мінска, «A-fest» мае шэраг своеасаблівых якасцяў, здольных вылучыць гэтую падзею. Галоўная асаблівасць у тым, што фестываль будзе праходзіць на траве і не дзе-небудзь, а ў Лошыцкім парку, імя якога гаворыць само за сябе. Такі фармат для Мінска, што ні кажы, — «неабжыты». Да таго ж, фестываль пройдзе напярэдадні дня нараджэння графа Чапскага, найвыбітнейшага мэра горада, а гэта значыць, што мерапрыемствы будзе сумяшчаць гісторыю і сучаснасць. Уласна мне ўжо цікава, як папулярны музычны гурт Brainstorm будзе выглядаць у спалучэнні з рэканструкцыяй адпачынку XIX стагоддзя».

З фестывалем «A-fest» мы зноў маем справу з распаўсюджаным у культурных імпрэзах міксаваннем розных часоў, можна сказаць, розных вымярэнняў. Уласна рэтра, якое ва ўсе часы выяўлялася ў калекцыянаванні, модзе, інтэр'ерах — адна з праяў цікавасці да аб'яднання старога і новага. Музычная класіка ў масавай культуры, перайначанне ўзорнага жывапісу, выступы папулярных кінаакцёраў у акадэмічных установах тыпу філармоній, аб'яднанне ў гарадскіх мерапрыемствах аўтэнтыкі з апошнімі здабыткамі — спалучэнне класічнага і масавага, традыцыйнага і сучаснага як тэндэнцыя праяўляе сябе ў сучаснай культуры даволі яскрава. Што можна ўбачыць па тым, чым насычаецца наша культурнае жыццё.

**Спалучэнне класічнага і масавага, традыцыйнага і сучаснага як тэндэнцыя праяўляе сябе ў сучаснай культуры даволі яскрава.**

«Я прыехала сюды працаваць з Расіі, у Мінск увогуле прыязджае адпачываць шмат людзей з-за мяжы, — працягвае Ганна Губкіна. — Вачыма староннага назіральніка магу сказаць: галоўнае, што ўражвае наведвальнікаў горада, — вялікая колькасць паркавых ансамбляў. Такога маштабу і разнастайнасці, напэўна, няма нідзе. Як некалі граф Чапскі, мы хочам зрабіць свой унёсак у развіццё горада. Тут накоплены высокі еўрапейскі ўзровень, вялікія месцы кшталту паркаў могуць стаць пляцоўкамі вялікіх мерапрыемстваў. Мы хочам стварыць падзею, якая бператварыла парк у жывое месца, каб 13 жніўня стала для людзей знакавай датай».

Надзея Ількевіч, якая разам з камандай урбаністаў працавала над стратэгіяй развіцця Лошыцкага парка і адпаведна над праектам фестывалю, кажа, што яны арыентаваліся на вопыт развіцця паркаў Еўропы, але з ухілам на культуру Беларусі. «У нас шмат традыцыйных фестываляў, але важна стварыць лакальную душэўную падзею, якая б уключала пласт беларускай культуры, чаго нам насамрэч не хапае. Фэст можа стаць папулярным турыстычным мерапрыемствам, нагодай для жыхароў больш даведацца пра сваю гісторыю».

Такое спалучэнне — сучаснасць, якая арыентуецца на даўніну, — здольна прыцягнуць вялікую аўдыторыю, што зразумела не ў апошнюю чаргу стала прычынай развіцця тэндэнцыі. Музычныя гурты, Brainstorm у якасці хэдлайнера, «Мазгабойня» і іншыя гульні, еўрапейская і беларуская кухні, парад вусачоў і барадачоў і барбер-фэст, на якім будзе вызначаны найлепшы цырульнік для барадачоў, самакаты — гэта даволі маштабная праграма і, напэўна, сапраўды нешта новае для культурнага жыцця Мінска. А яго зашмат не бывае.

Уваход на фестываль «A-fest», што будзе праходзіць у Лошыцкім парку 13 жніўня з паўдня да адзінаццаці гадзін вечара, вольны.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.** *katsyalovich@zviazda.by*